*Алег Аляхновіч*

# АБРАДАВАЯ ПЕСНЯ Ў СВЯЦЕ

Ніводнае народнае свята не абыходзіцца без выкарыстання абрадавай песні. Яна раскрывае сімволіку рытуальных дзей, асаблівасці міфалагічнага мыслення старажытнага чалавека, спецыфіку сацыяльнага асяроддзя, пэўнага жыццёвага ўкладу грамадства і інш. Для рэжысёра абрадавы фальклор – каштоўны мастацкі матэрыял для развіцця вобразнага мыслення і ўвасаблення рэжысуры святочнай дзеі, ён будзіць фантазію выканаўцаў, стварае «фальклорную сітуацыю», у якой знікае падзел паміж «артыстамі» і гледачамі. Так, у адной з абрадавых песень пры дапамозе сімвалаў ствараецца вобраз каляднага свята: наведваючы хаты, Каляда заўважае, што ў першай – «куццю таўчуць», у другой – «сала шыпіць», у трэццяй – «серабро звініць», у чацвёртай – «золата блішчыць», у пятай – «каўбасу пячуць». Як бачым, у гэтай песні «рэжысура» святочнай каляднай дзеі прадстаўлена ў закончаным выглядзе.

Абрадавая песня дапамагае рэжысёру ў распрацоўцы сцэнарыя народнага свята, у развіцці яго драматургіі, адлюстраванні лакальнай традыцыі, якая знаходзіць увасабленне ў асаблівасцях жывой гутарковай мовы канкрэтнай мясцовасці, дыялектах, манеры выканання і інш.

Зразумела, што абрадавыя песні адрозніваюцца паміж сабою. Па прызначэнні, месцы і часе выканання іх можна падзяліць на некалькі груп: рытуальныя, заклінальныя, велічальныя, гульнявыя, лірычныя. Асноўным пластом абрадавай паэзіі з'яўляюцца песні магічна-заклінальнага зместу, якія маюць адзіную функцыю – ўздзейнічаць на прыроду для забеспячэння дабрабыту і шчасця, дапамагчы чалавеку ў яго барацьбе за будучае.

Паколькі гаспадарчая праца чалавека, яго жыццёвы ўклад звязаны з каляндарнымі цыкламі, у песнях адлюстравалася дзейнасць людзей, адпаведныя з'явы, звязаныя з той ці іншай парой года. У многіх творах раскрываецца барацьба дзвюх пораў года, паказваецца працэс пераходу ад зімы да вясны, а затым да лета. Каб паказаць вобразнае ўспрыманне чалавекам прыроды, адносіны яго да рэчаіснасці, у абрадавай песні выкарыстоўваюцца разнастайныя паэтычныя сродкі і прыёмы: эпітэты, параўнанні, метафары, паўторы, псіхалагічныя паралелізмы і інш.

Многія абрадавыя песні маюць жартоўны змест, які раскрывае адмоўныя рысы характару і паводзіны людзей, малююць камічныя жыццёвыя сітуацыі і інш.

Вялікую групу песень утвараюць карагоды, асабліва веснавыя. Гэтыя творы нясуць яскравы эмацыянальны пачатак, спалучаюць драматычныя, танцавальныя, песенныя элементы. Змест гэтых твораў паказвае ўзаемаадносіны паміж людзьмі, чалавекам і прыродай у забаўляльнай форме.

Меладычны пачатак многіх абрадавых песень разгортваецца звычайна ў межах вузкіх інтэрвалаў – тэрцыі, кварты, квінты. Яны даступныя для выканання, простыя па форме, у іх закладзены вялікія магчымасці для засваення інтанацыйных, гарманічных, ладавых, рытмічных асаблівасцей, прыёмаў і навыкаў культуры народных спеваў.

Вывучэнне рэжысёрам абрадавай песні, асабліва яе варыянтаў, паэтычных тэкстаў, дазваляе зразумець, чаму яна была складзена, як магла ўзнікнуць, каму ці чаму прысвячаецца, якія і як перадае пачуцці і інш. Адказ на гэтыя пытанні развівае творчую ініцыятыву, узбагачае мастацкую палітру святочнай дзеі, дазваляе ўвасобіць яе ў эстэтычным накірунку, у адпаведнасці з патрабаваннямі часу.

Для кампетэнтнага выкарыстання абрадавай песні ў свяце важна вылучыць яе рэгіянальную, мясцовую прыналежнасць. Для гэтага неабходна пазнаёміцца з мясцовымі звычаямі, абрадамі, народнымі выканаўцамі і знаўцамі традыцыі. Абрады вызначаюць многія сэнсавыя, стылявыя выразныя асаблівасці песень, якія да іх дапасуюцца і, наадварот, у песнях раскрываецца змест абрадавых дзей. І гэта заканамерна, таму што сувязь абрада і песні ажыццяўляецца на дзейсным і мастацкім узроўнях.

Для абрадавай песні не характэрны ярка выражаныя знешнія сродкі. Пачуцці яна раскрывае эканомна, як бы ў паўтонах. Значную ролю ў раскрыцці яе эстэтычнага ідэалу маюць пэўныя ўмовы, такія як асоба і настрой выканаўцаў, месца і час, характар і абставіны быту і г.д. Таму зафіксаванае ў нотным запісе абрадныя песні не адлюстроўваюць усю глыбіню беларускага меласу. Пры знешняй прастаце і схематычнасці яны змяшчаюць глыбокія душэўныя перажыванні, яркія музычныя вобразы. Вонкавая выразнасць выканання абрадавай песні павінна быць вынікам эмацыянальнага стану выканаўцаў, а не штучнай ігры «на публіку». Іншы раз яшчэ сустракаюцца надуманыя позы, жэсты, рухі ўдзельнікаў. Галоўнае ў песнях – гэта перадаць сэнс, характар, а не імкненне «праілюстраваць» тэатральнымі сродкамі яе змест.

Характар песні вызначае метад яе ўвасаблення. Творы спакойнага характару, працяжныя, не патрабуюць пры іх узнаўленні якой-небудзь знешняй тэатралізацыі, але вакальнае майстэрства праяўляецца ў іх больш за ўсё. Практыка паказвае, што ў такіх песнях дзеянне выканаўцаў, выраз твараў, пастава спевакоў павінны адпавядаць духу песні. Бо калі абрадавую песню, у якой расказваецца аб любові да роднага краю, да прыроды, да бацькоўскай хаты, выконваць без дзейснага пачыну, з невыразным тварам, то песня не будзе ўспрымацца як мастацкі твор, не выкліча ў гледачоў свята адпаведнага эмацыянальнага суперажывання. Унутраная сабранасць, падцягнутасць выканаўцаў павінны садзейнічаць раскрыццю ідэйнага зместу песні, а знешняя выразнасць – быць вынікам эмацыянальнага стану спевакоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Зразумела, што выкананне абрадавай песні ў сцэнічных умовах патрабуе ад спевакоў авалодання некаторымі некаторымі навыкамі і ўменнямі акцёрскай ігры. Сцэна падзяляе выканаўцаў і гледачоў, стварае штучныя ўмовы ўзаемаадносін паміж імі, вызначае рэгламент выканання твору, абавязывае спевакоў ажыццяўляць рухі, паклоны, жэсты, мізансцэны і інш.

Як паказвае практыка, многія выканаўцы песень не валодаюць сцэнічным майстэрствам, спяваюць статычна, у выніку гэтага можна заўважыць прымітывізм інтэрпрэтацыі твору. У гэтых умовах неабходна дапамога рэжысёра, якому неабходна ажыццявіць своеасаблівы рэжысёрскі аналіз абрадавай песні з завязкай дзеяння, персанажамі, развіццём сюжэта, канфліктам, кульмінацыяй, заканчэннем, стварыць на яе аснове маленькі «спектакль».

Абрадавыя песні ўтрымліваюць розныя міфалагічныя персанажы: Каляду, Купалу, Лялю, Масленіцу, «казу», «мядзведзя» і інш. У песнях гэтыя персанажы малююцца як персаніфікаваныя істоты, якія ўвасабляюць вобразнае ўспрыманне старажытным чалавекам узаемааднсін зямлі і космасу, у змене каляндарных цыклаў, раскрываюць іх складаную семантыку паводзін з іншымі прыроднымі персанажамі. Напраклад, паводле версіі А.Кіркора, даследчыка язычніцтва, у час зімовага сонцавароту Сіцівpат або Карачун, бог цемры і смерці змагаецца з Грамавікам (Перуном) за ўладарнасць над светам. З гэтай мэтай Сіцівpат ператвараецца ў бурага мядзведзя, бярэ сабе на дапамогу бога марозаў Зюзю, белага старца з сівой барадой, у белым кажусе, з жалезнай булавой у руках, збірае воўчую зграю (мяцеліцу) і ганяецца за жонкай Перуна Грамаўніцай, якая павінна нарадзіць сына Дажбога. Але Каляда-Грамаўніца хаваецца ў іўняках, нараджае Божыча (Дажбога) і чыніць спор людзям: Гдзе каза ступою, // Там жыта капою, // Гдзе каза рогам, // Там жыта стогам, // Гдзе каза ходзіць, // Там жыта родзіць.

Для рэжысёра семантычная калядная версія пра нараджэнне Дажбога – змястоўны матэрыял для пабудовы абрадавага песеннага спектакля «Зімовы сонцаварот», у якім ён можа ў мастацка-вобразнай форме перадаць касмічную з'яву Каляды. На наш погляд, абрадавая песня ў свяце павінна выкарыстоўвацца ў складзе абрада або яго фрагмента. Гэты метадычны падыход найбольш адпавядае кампетэнтнаму выкарыстанню фальклорнага твору ў свяце, набліжае яго да жывога бытавання традыцыі.

Як сведчыць практыка, выкананне каляндарных і сямейных песень у свяце не заўсёды эстэтычна прымальнае ў сэнсе дакладнай падачы слова пры спевах, тым больш, што многія песенныя тэксты заключаюць часам архаічныя словы, незразумелыя сучаснаму слухачу. У прынцыпе, рэжысёр можа з вялікай асцярожнасцю замяніць асобныя незразумелыя словы, без шкоды для агульнага сэнса песні, але агульнае метадычнае патрабаванне заключаецца ў тым, каб прапанаваць выканаўцам прааналізаваць яе паэтычны тэкст, вызначыць прыёмы і сродкі паэтыкі, прачытаць іх выразна, звярнуўшы ўвагу на дакладную дыкцыю і артыкуляцыю кожнага слова. Знаходжанне багацця моўных інтанацый пры ўважлівым вусным чытанні песні, садзейнічае раскрыццю характара, тэмы і ідэі твору, выразнай падачы слова пры спевах.

Абрадавыя песні, як правіла, аднагалосыя, таму іх не трэба «аздабляць», далучаючы галасы. Іх неабходна ў свяце захаваць у першаснай чысціні меласу. У свяце абрадавая песня займае важнае, але падпарадкавальнае месца, скіраванае на мастацкае ракрыццё рытуальных дзей, дапаўняючы іх. Рэжысёру важна ведаць, што песенныя інтанацыі-формулы абрадавых твораў з'яўляюцца вынікам зафіксаванага мастацкага мыслення старажытнага чалавека. Разам з іншымі абрадавымі прыкметамі яны ўтвараюць этнічную спецыфіку беларусаў. Менавіта таму рэжысёр абавязан, выкарыстоўваючы абрадавую песню ў свяце, адказна ставіцца да яе ўвасаблення.

Да важных асаблівасцей узнаўлення абрадавай песні ў свяце неабходна аднесці імправізацыю. Імправізацыя пры іх выкананні – вельмі складаная для авалодання манера спеваў. Сапраўдныя знаўцы народных песень заўёды імправізіруюць пры калектыўных (гуртавых) спевах. Гэта імправізацыя адбываецца заўсёды ў межах канкрэтнай абрадавай традыцыі. Для сучасных спевакоў авалоданне імправізацыяй – складаная справа. Практычна немагчыма сустрэць сярод майстроў імправізацыі маладых выканаўцаў. Відаць, што навучанне імправізацыі ў народных спевах належыць будучыні.

У заключэнне адзначым, што пры выкарыстанні абрадавай песні ў свяце рэжысёр абавязан: узнаўляць песню ў складзе абрада або яго фрагмента; распрацаваць яе мастацка-вобразнае ўвасабленне; не дапускаць апрацовак абрадавых песень; навучыць выканаўцаў навыкам і ўменням сцэнічнага выступлення.

**Спіс літаратуры:**


1. Аляхновіч, А.М. Абрадавая музыка / А.М. Аляхновіч // Культура Беларусі : Энцыклапедыя. Т.1 / рэдкал.: Т.У. Бялова (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П.Броўкі, 2010. – С. 18-19.
2. Зімовыя святы / аўт.-укл. А. Аляхновіч, А.Лозка. – Мінск : Беларусь, 1999. – С. 51.
3. Беларуская народная творчасць. Паэзія беларускага земляробчага календара / укл. і сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. А.С. Ліса, нар. каляндар У.А. Васілевіча. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 554 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ